# РАМАНЧУК Яраслаў Чэслававіч



Нарадзіўся 10 студзеня 1966 г. у гарадскім пасёлку Сапоцкін Гродзенскай вобласці. Там жа з залатым медалём закончыў сярэднюю школу. З 1984 па 1986 г. служыў у Савецкай Арміі на Алтаі. У 1990 г. з адзнакай закончыў інстытут і ў 2000 г. — аспірантуру БДУ па спецыяльнасці «эканоміка».

Акрамя родных беларускай і рускай, валодае англійскай, польскай і французскай мовамі.

Атрымаў вопыт работы ў бізнесе, працуючы дырэктарам прадпрыемства «МАРИОН». У цяперашні час узначальвае Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Аналітычны цэнтр «Стратэгія».

Атрымаў больш за дзесяць прэстыжных дыпломаў і ўзнагарод па эканоміцы, у тым ліку Atlas Economic Research Foundation (2006, 2007). Напісаў 8 кніг па сістэмнаму рэфармаванню эканомікі.

У 1996 г. Я.Ч.Раманчук працаваў у камісіі па эканамічнай палітыцы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

З'яўляецца адным з заснавальнікаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі, у 2000 г. быў абраны намеснікам Старшыні партыі. Неаднаразова ўдзельнічаў у міжнародных палітычных і эканамічных форумах.